## Дзецьмі ганарылася па праву

«Дай бог дзяцей і ў дзецях толк». Зараз гэту прымаўку ўжо і не пачуеш. Але ж яшчэ зусім нядаўна яна ўжывалася вельмі часта. На жаль, не кожнай маці ў гэтым сэнсе шанцуе. А вось Софіі Сямёнаўне Старавойтавай пашанцавала. Ды яшчэ як!

Дзевяцярых дзяцей яна нарадзіла і выхавала. І кожны з іх стаў для маці ўрадасць. Кожным яна ганарылася па праву. Памятаецца, як у 1973 г. у час нашай сустрэчы з гэтай сям'ёй у вёсцы Лебядзёўка Софія Сямёнаўна распавядала аб сваім жыцці-быцці, аб дзецях. Вось сын Аляксандр Герой Сацыялістычнай Працы, былы дэпутат Вярхоўных Саветаў СССР і БССР шэрагу склікanняў, вядомы на ўсей Магілёўшчыне будаўнік.



С.С.Старавойтава.

А дачка Антаніна — заслужаная настаўніца БССР, узнагароджана медалём «За доблесную працу». Усёй Слаўгарадчыне вядомы і імёны яшчэ трох педагогаў з гэтай сям'і — Марыі, Валянціны і Кацярыны. А старшую хірургічную сястру Слаўгарадскай гарадской бальніцы Аляксандру Паўлаўну Старавойтаву не ведае хіба толькі той, хто ніколі не быў у раёне. Яна таксама адзначана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна».

Знайшлі сваё месца ў жыцці і сыны Васілій, Віктар і Фёдар — афіцэр, інжынер, юрыст.

Дык як жа было не ганарыцца імі Софіі Сямёнаўне і Паўлу Іўкавічу Старавойтавым.

*В.П.Ерашэнка.*

## Родам са Слаўгарадчыны

Шчодрая слаўгарадская зямля багатая на таленавітых і працавітых людзей. Сярод іх ёсць абаронцы Айчыны, вучоныя, дзяржаўныя дзеячы, паэты, кампазітары, артысты, мастакі, адным словам, прадстаўнікі розных прафесій.

Сваёй плённай дзейнасцю ў розных галінах народнай гаспадаркі, навукі, культуры яны памнажаюць багацце і славу роднай зямлі, уносяць важкі ўклад у справу развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры свайго народа.

### ВАЙСКОЎЦЫ

**БЯЛЯЕЎ Адам Юр'евіч.** Палкоўнік, камандзір танкавага палка. Нарадзіўся ў канцы XIX ст. у в. Васькавічы ў беднай сялянскай сям'і. Пасля ўстанаўлення на Слаўгарадчыне савецкай улады пайшоў у Чырвоную Армію. Пачынаў службу ў кавалерыі, потым перавучваўся на танкіста. Гітлераўскіх захопнікаў сустрэў на заходняй граніцы. З баямі выходзіў з акружэння. У 1943—1944 гг. удзельнічаў у вызваленні Беларусі. У гэты час ён ужо быў камандзірам танкавага палка. Узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. Пасля звальнення ў запас А.Ю.Бяляеў жыў у г. Мінеральныя Воды Стаўрапольскага краю, дзе і памёр.

**ВАШЧЫЛА Іван Іванавіч.** Палкоўнік, начальнік штаба дывізіі ўнутраных войскаў. Нарадзіўся ў 1921 г. у в. Папоўка ў беднай і мнагадзетнай сям'і. Рос і выхоўваўся ў матчынай сястры Варвары і яе мужа Антона Пятровіча Аксёненкі. Юнака, як і большасць яго равеснікаў, прываблівала прафесія абаронца Радзімы, і ён стаў ім. Прайшоў усю Вялікую Айчынную вайну. Баявая мужнасць І.І.Вашчылы адзначана ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, нагрудным знакам МООП, медалямі. У 1978 г.

зволыніўся ў запас і пераехаў на пастаяннае месца жыхарства ў Мінск. Памёр у 1991 г.

**ДРАЙЧУК Якаў Іванавіч.** Военачальнік, генерал-маёр авіяцыі (1946), удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Нарадзіўся 3.11.1901 г. у в. Ржаўка Слаўгарадскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1920 г. У 1921—1924 гг. у часцях асобага прызначэння. З 1924 г. супрацоўнік газеты «Новая вёска» (орган Гомельскага губкома), на партыйнай і савецкай рабоце. З 1933 г. інструктар палітаддзела Віцебскай авіяцыйнай брыгады. У час Вялікай Айчыннай вайны на Паўночна-Заходнім і 1-м Беларускім франтах. З кастрычніка 1944 г. па май 1947 г. праходзіў службу ў Войску Польскім: начальнік палітаддзела, нам. камандуючага ВПС Польскай Народнай Рэспублікі. Потым служыў на Далёкім Усходзе — нам. камандуючага 54-й паветранай арміяй. З ліпеня 1952 г. у запасе. Узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі і шасцю медалямі, а таксама трыма ордэнамі і трыма медалямі Польскай Народнай Рэспублікі, медалём «За вызваленне Карэі». Памёр 13.10.1978. Пахаваны на радзіме. У в. Ржаўка яго імем названа бібліятэка, пабудаваная і ўкамплектаваная на сродкі Я.І.Драйчука.

**ЕРАШЭНКА Васіль Ігнатавіч.** Палкоўнік. Нарадзіўся 4.6.1930 г. у в. Ганчароўка Слаўгарадскага раёна. У Савецкай Арміі з 1951 г. Пасля заканчэння сярэдняй школы паступіў у Ленінградскае артылерыйскае вучылішча. Некалькі гадоў камандаваў узводам у Беларускай ваеннай акрузе. У 1965 г. пасля заканчэння Ваеннапалітычнай акадэміі імя У.І.Леніна быў накіраваны ў Групу савецкіх войскаў у Германіі. У 1965—1970 гг. намеснік камандзіра артпалка па палітчастцы, намеснік начальніка палітаддзела артдывізіі, у 1970—1977 гг. начальнік палітаддзела артдывізіі ў г. Усурыйск Прыморскага краю. З 1977 г. начальнік палітаддзела Казанскага вышэйшага артылерыйска-інжынернага вучылішча. Дэлегат XXV з'езда КПСС. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. З 1981 г. у запасе. Памёр 1.7.1995 г. Пахаваны ў г. Гомель.

**ЛОСЕЎ Андрэй Цімафеевіч.** Палкоўнік. Нарадзіўся ў в. Кулікоўка Слаўгарадскага раёна ў беднай сялянскай сям'і, рана застаўся без бацькі. Скончыў 7 класаў Баханскай школы. Быў прызваны ў Чырвоную Армію. Стаў лётчыкам. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі.


І.І.Вашчыла.


Я.І.Драйчук.


В.І.Ерашэнка.


З.С.Малахаў.

**МАЛАХАЎ Зосім Сцяпанавіч.** Нарадзіўся на пачатку стагоддзя ў в. Целяшы. Юнацтва вясковага хлопца гартавалася на Каспіі, дзе ён у складзе ваеннай флатыліі абараняў маладую Рэспубліку Саветаў у гады грамадзянскай вайны. Вялікую Айчынную скончыў у званні капітана 1-га рангу. За мужнасць у барацьбе з ворагам З.С.Малахаў узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга (двойчы), Чырвонай Зоркі, медалямі. У пасляваенны час ветэран савецкага Ваенна-Марскога Флоту доўга падтрымліваў сувязі з піянерамі і камсамольцамі слаўгарадскай СШ № 1. Гэта менавіта ім ён даслаў у 1972 г. фотакартку, якая і ўвайшла ў нашу хроніку.

**МАРЧАНКА Іван Васільевіч.** Палкоўнік. Ваенны гісторык, кандыдат


І.В.Марчанка.


М.А.Пчалоў.


Г.Я.Рубанаў.


М.Е.Рыжанкоў.

гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся 14.1.1923 г. у в. Людкоў Слаўгарадскага раёна ў сям'і настаўніка. У 1940 г. скончыў Слаўгарадскую СШ і паступіў у БДУ. З 1.7.1941 г. да 22.3.1942 г. слесар, тэхнік-нарміроўшчык ваеннага завода ў г. Мурам. 22.3.1942 г. прызваны ў рады Чырвонай Арміі. У тым жа годзе скончыў 1-е Омскае ваенна-пяхотнае вучылішча. Са снежня 1942 г. да мая 1944 г. удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне на Паўночна-Заходнім, 2-м Беларускім і 3-м Прыбалтыйскім франтах. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі, Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

У пасляваенны час скончыў БДУ (1950), Вышэйшы ваенна-педагагічны інстытут імя М.І. Калініна (1955). Працаваў выкладчыкам гісторыі і Канстытуцыі СССР на Цэнтральных курсах удасканалення афіцэрскага складу, у Свярдлоўскім суvoраўскім ваенным вучылішчы. З сакавіка 1974 г. у адстаўцы. Апошнія гады жыцця займаў пасаду намесніка начальніка ваеннай кафедры БДУ. Памёр 4.5.1987 г. Аўтар кнігі «Священный долг» (Мн., 1987).

**ПЧАЛОЎ Міхаіл Апанасавіч.** Палкоўнік, кандыдат ваенных навук. Нарадзіўся 12.2.1921 г. у в. Бярозаўка Слаўгарадскага раёна ў сялянскай сям'і. 18.11.1939 г. прызваны ў Чырвоную Армію і накіраваны ў школу малодшага камсаставу 53-га асобнага батальёна сувязі 15-й мехдывізіі Адэскай ваеннай акругі. У Вялікую Айчынную вайну на Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, Бранскім, Цэнтральным, Беларускім, 2-м Беларускім франтах. Вайну закончыў на пасадзе камандзіра 527-га асобага батальёна сувязі 15-й стралковай дывізіі 2-га Беларускага фронту. Быў паранены. Пасля вайны працаваў старшым выкладчыкам у Ваеннай акадэміі сувязі ў Ленінградзе. Узнагароджаны ордэнамі Багдана Хмяльніцкага III ступені, Айчыннай вайны II ступені, трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі, знакам «Ганаровы радыст СССР». Памёр 11.9.1976 г. Пахаваны ў Санкт-Пецярбургу.

**РУБАНАЎ Генадзь Якаўлевіч.** Палкоўнік. Нарадзіўся 1.3.1951 г. у в. Аляксандраўка-1 Слаўгарадскага раёна. У 1966 г. скончыў Аляксандраўскую васьмігадовую школу, у 1968 г. слаўгарадскую СШ № 2. У 1968 – 1971 гг. курсант Апоцкага зенітна-ракетнага вучылішча. Служыў у часцях процiпаветранай абароны (ППА) Беларускай ваеннай акругі. Пасля заканчэння ў 1985 г. Ваеннай акадэміі ППА імя Г.К.Жукава праходзіў службу ў Калінінградскай вобласці, войсках Туркестанскай акругі, вучэбным цэнтры войскаў ППА.

**РЫЖАНКОЎ Мікалай Емяльянавіч.** Нарадзіўся ў 1918 г. у в. Чачораўка ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Слаўгарадскай сярэдняй школы паступіў у ваеннае артылерыйскае вучылішча. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, прайшоў усе ступені службовай лесвіцы, пачынаючы ад камандзіра ўзвода да камандзіра палка і брыгады.

Пасля вайны скончыў ваенную акадэмію і працягваў службу ў радах Савецкай Арміі ў розных ваенных акругах, апошнія гады – у Кіеўскай. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі (двойчы) і звыш 15 медалямі.

**САМУСЕНКА Віктар Фёдаравіч.** Палкоўнік. Нарадзіўся у 1925 г. у в. Рудня Васькавіцкага сельсавета Слаўгарадскага раёна. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Віктар разам з сястрой, падпольшчыцай, збіраў зброю для партызан. З мая 1943 г. баец 43-га партызанскага атрада, з кастрычніка 1943 г. у Чырвонай Арміі. Служыў у разведузводзе 425-га асобнага сапёрнага батальёна 362-й стралковай дывізіі. Вызваляў Беларусь, наводзіў пераправы і будаваў масты цераз Дняпро, Бярэзіну, Нёман, Буг, Віслу. Вайну закончыў у Германіі. У 1946 г. паступіў у Растоўскае ваеннае вучылішча, стаў кадравым афіцэрам. З 1976 г. у запасе. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны, медалямі. Жыве ў Мінску.



В.Ф.Самусенка.



Р.Р.Аксёненка.

**ВУЧОНЫЯ**

**АКСЁНЕНКА Рыгор Раманавіч.** Прафесар, доктар медыцынскіх навук. Нарадзіўся ў 1930 г. у в. Ганчароўка Слаўгарадскага раёна. Сярэднюю адукацыю атрымліваў у тры этапы: пайшоў у школу да вайны, вучыўся ў вайну і ў пасляваенны час. Па ўсіх прадметах паспяваў на выдатна, за што атрымаў мянушку Ганчароўскі Прафесар. Быў прызнаны кандыдатам на залаты медаль. Праўда, атрымаў толькі сярэбраны, таму што на Васькавіцкую СШ у той год наогул медаля вышэйшага гатунку не далі. Але і з «серабром» юнак адразу ж пасля школы ў 1950 г. прайшоў па конкурсе ў Ленінградскую ваенна-медыцынскую акадэмію імя С.М.Кірава.

У 1956 г. Р.Р.Аксёненка, атрымаўшы дыплом з адзнакай і воінскае званне старшы лейтэнант, быў накіраваны на Паўночны флот. Тут ён сваю нялёгкую службу ваеннага медыка сумяшчае з далейшай вучобай і ў 1964 г. абараняе кандыдацкую дысертацыю. Гэта адчыніла маладому вучонаму дзверы ў вялікую навуку. У 1965 г. Рыгор Раманавіч прызначаецца выкладчыкам, потым старшым выкладчыкам кафедры эпідэміялогіі і гігіены ваенна-медыцынскага факультэта пры Томскім медінстытуце. У 1974 г. абараніў доктарскую дысертацыю. У 1977 г. Р.Р.Аксёненку, на ліку якога ўжо былі значныя навуковыя адкрыцці, прызначаюць загадчыкам кафедры эпідэміялогіі і гігіены ваенна-медыцынскага факультэта пры Куйбышаўскім медінстытуце. Тут ён працаваў на працягу 8 гадоў. Яго плённая праца адзначана ордэнам «За службу Радзіме ва Узброенных Сілах СССР» III ступені, медалямі, аўтарскім пасведчаннем «Вынаходца СССР». Але шматгадовыя даследаванні вучонага, неаднаразовыя выпрабаванні на сабе атрыманых вынікаў адбіліся на стане яго здароўя.

У 1984 г. палкоўнік медыцынскай службы Р.Р.Аксёненка звольніўся ў запас, вярнуўся ў родную Беларусь і пачаў працаваць у Мінскім інстытуце ўдасканалення ўрачоў. У яго былі вялікія планы, шмат задум. Але не-не ды і падводзіла здароўе. Амаль увесь 1990 г. ён правёў на бальнічным ложку. Выпісаўся толькі ў пачатку наступнага года. І адразу ж — з лекцыяй на кафедру. Спяшаўся ён нездарма. Праз некалькі дзён яго не стала. Памёр Р.Р.Аксёненка 11 студзеня 1991 г.

*В.П.Ерашэнка.*

**БАЛУКОЎ Іван Цімафеевіч.** Доктар эканамічных навук, прафесар. Нарадзіўся ў 1922 г. у в. Бярозаўка Слаўгарадскага раёна. У 1937 г. пасля заканчэння сямігодкі паступіў у Магілёўскае дашкольнае педвучылішча, потым — у ваеннае авіяцыйнае вучылішча. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце, штурман самалёта. У 1945 г. у паветраным баі страціў нагу. У гэтым жа годзе былы франтавік стаў студэнтам эканамічнага факультэта Харкаўскага дзяржаўнага універсітэта. Скончыўшы універсітэт, а потым аспірантуру, працаваў выкладчыкам палітэканоміі ў Харкаўскім політэхнічным інстытуце, выкладчыкам, загадчыкам кафедры палітэканоміі Адэскага інстытута інжы-


І.Ц.Балукоў.


Д.С.Варанцоў.


А.І.Гоеў.


Н.П.Емяльянаў.


І.П.Зяцькоў.

нераў воднага транспарту. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1991 г.

**ВАРАНЦОЎ Даніла Сямёнавіч.** Электрафізіёлаг, акадэмік АН Украіны (1957). Нарадзіўся 24.12.1886 г. у Слаўгарадзе. Скончыў Пецярбургскі універсітэт (1912), спецыялізаваўся ў лабараторыі М.Я.Увядзенскага. У 1922 г. арганізаваў кафедру фізіялогіі ў Смаленскім універсітэце. З 1930 г. загадчык кафедры фізіялогіі Казанскага універсітэта, а ў 1935—1941 гг. Кіеўскага медінстытута. У 1945 г. стварыў аддзел агульнай фізіялогіі ў Інстытуце фізіялогіі Кіеўскага універсітэта і ў 1956 г. лабараторыю электрафізіялогіі ў Інстытуце фізіялогіі АН УССР. Асноўныя працы вучонага — па электрафізіялагічным вывучэнні працэсаў узбуджэння і тармажэння ў нервовай тканцы. Адкрыў (1924) і прааналізаваў следавую электраадмоўнасць, якая ўзнікае ў нерве пасля імпульсу. Вывучаў прыроду павольных электрычных ваганняў у цэнтральнай нервовай сістэме. Аўтар прац «Агульная электрафізіялогія» (1961), «Фізічны электратон нерваў і мышцаў» (1966, у сааўтарстве). Памёр 21.7.1965 г.

**ГОЕЎ Аляксандр Іванавіч.** Кандыдат тэхнічных навук. Нарадзіўся ў 1948 г. Скончыў слаўгарадскую СШ № 1, Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, Акадэмію народнай гаспадаркі СССР. Працаваў на розных пасадах. Апошняя, якую ён займае з 1987 г., — генеральны дырэктар Краснагорскага завода імя Зверава ў Маскоўскай вобл. А.І.Гоеў віцэ-прэзідэнт міжнароднай акадэміі «Кантэнант», член вучонага савета акадэміі развіцця персаналу.

**ЕМЯЛЬЯНАЎ Несцер Пятровіч.** Доктар хімічных навук (1970), прафесар. Нарадзіўся 11.11.1898 г. у в. Ляцягі Слаўгарадскага раёна ў сялянскай сям'і. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1932 г. скончыў Гомельскі педінстытут і шмат гадоў займаўся педагагічнай дзейнасцю. У 1956—1970 гг. працаваў у Інстытуце фізіка-арганічнай хіміі АН БССР, з 1962 г. загадваў лабараторыяй нафтахімічнага аналізу гэтага інстытута, вёў даследаванні ў галіне нафтэнавых вуглевадародаў. Аўтар больш за 20 вынаходстваў. Памёр 29.9.1970.

**ЗЯЦЬКОЎ Іван Паўлавіч.** Кандыдат фізіка-матэматычных навук (1963), дацэнт (1963). Нарадзіўся 26.8.1926 г. у Слаўгарадзе. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, партызан. У 1957 г. скончыў БДУ. У 1957—1960 гг. аспірант, у 1960—1963 гг. асістэнт, старшы выкладчык кафедры фізічнай оптыкі, з 1963 г. дацэнт. У верасні 1963 г. — чэрвені 1979 г. дэкан фізічнага факультэта БДУ. У сакавіку 1979 г. — студзені 1985 г. — прарэктар БДУ па навуковай рабоце. У красавіку 1981 г. — верасні 1993 г. — загадчык кафедры

фізічнай оптыкі БДУ, у 1993—1996 гг. дацэнт гэтай кафедры. З верасня 1996 г. на пенсіі. Заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі (1982), выдатнік народнай адукацыі Беларусі (1978).

Навуковыя даследаванні ў галіне малекулярнай спектраскапіі і люмінесцэнцыі, інфрачырвонай спектраскапіі і спектраскапіі камбінацыйнага рассейвання арганічных пераксідных злучэнняў. Апублікаваў у навуковай перыёдыцы больш за 200 артыкулаў, атрымаў 30 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы. Падрыхтаваў 13 кандыдатаў фізіка-матэматычных навук.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

**ЛАМАЧЭНКА Іван Мікалаевіч.** Доктар медыцынскіх навук (1973), прафесар. Нарадзіўся 7.1.1932 г. у в. Цераховка Слаўгарадскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1951 г. скончыў Васькавіцкую СШ, у 1957 г. — лячэбны факультэт Смаленскага медыцынскага інстытута. У 1957—1962 гг. працаваў урачом-хірургам, галоўным урачом, загадчыкам раённага аддзела аховы здароўя ў Пскоўскай вобласці. Потым вучыўся ў аспірантуры па хірургіі ў Смаленскім медінстытуце. З 1965 г. па 1971 г. асістэнт і дацэнт кафедры шпітальнай хірургіі, з 1971 г. загадчык кафедры дзіцячай хірургіі з траўматалогіяй і артапедыяй таго ж інстытута. Яго намаганнямі створаны і паспяхова працуюць у Смаленску 4 абласныя спецыялізаваныя аддзяленні на 170 ложкаў і дзіцячая хірургічная служба Смаленскай вобласці. У 1978—1984 гг. І.М.Ламачэнка — прарэктар па навуковай працы Смаленскага медінстытута. Выканаў больш за 2 тыс. аперацый. З'яўляецца аўтарам звыш 200 навуковых прац, 16 рацыяналізатарскіх прапаноў, 5 метадычных рэкамендацый і 8 зборнікаў навуковых прац. Ім упершыню ў Расіі і дзяржавах СНД вывучаліся і ўкараняліся для лячэння дзяцей з хірургічнымі захворваннямі плазменны скальпель, ультрагук і лазер. Член Міжнароднага каардынацыйнага камітэта «Урачы — супраць насілля і войнаў» (з 1993). І.М.Ламачэнка выбіраўся дэпутатам Смаленскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, членам абкома прафсаюзаў медыцынскіх работнікаў. Узнагароджаны



І.М.Ламачэнка.



М.Р.Ларчанка.

бронзавым медалём Галоўнага камітэта ВДНГ СССР. Жыве і працуе ў Смаленску.

**ЛАРЧАНКА Іван Пятровіч.** Кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся 6.1.1914 г. у в. Хварасцяны Слаўгарадскага раёна ў сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, быў паранены, інвалід 3-й групы. У 1945—1960 гг. выкладчык, старшы выкладчык, загадчык кафедры марксізму-ленінізму, прарэктар па навуковай і вучэбнай рабоце, у 1960—1971 гг. рэктар Магілёўскага педагагічнага інстытута. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, «Знак Пашаны», медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Памёр 7.7.1987 г.

**ЛАРЧАНКА Міхась** (Міхаіл Рыгоравіч; псеўданімы Міхась Вісажар, М.Чабор, М.Святланін). Беларускі літаратуразнавец, крытык. Нарадзіўся 14.11.1907 г. у в. Хварасцяны Слаўгарадскага раёна ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў Азарыцкай пачатковай школе. Працягваць вучобу далей не мог з-за беднасці. Працаваў на гаспадарцы, з вялікім душэўным гарэннем аддаўся грамадскай працы. У 1922 г. стаў першым камсамольцам у сваёй вёсцы. У 17 гадоў паступіў у Княжыцкую школу сялянскай моладзі (Магілёўскі раён), дзе многа чытаў, спрабаваў пісаць вершы, загадваў школьнай бібліятэкай, удзельнічаў у самадзейнасці. Скончыўшы школу, паступіў у Магілёўскі педтэхнікум. У 1929 г. з 2-га курса перайшоў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ. Свае вершы друкаваў у газетах «Чырвоная Беларусь», «Піянер Беларусі». У 1932 г.



В.Е.Лявончыкаў.



І.Я.Марчанка.

датэрмінова закончыў крытычна-творчую секцыю літфака Беларускага вышэйшага педінстытута, арганізаванага на базе педфака БДУ. У 1932—1935 гг. вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры і мастацтва АН Беларусі. У 1936 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Лірыка Якуба Коласа». Працаваў у гэтым жа інстытуце старшым навуковым супрацоўнікам (1935—1941), чытаў лекцыі ва універсітэце. З першых дзён Айчыннай вайны ваяваў на Бранскім фронце. У 1942 г. цяжка паранены, у 1943 г. дэмабілізаваны і вярнуўся ва універсітэт, які ў час вайны знаходзіўся на станцыі Сходня пад Масквой. З 1944 г. у Мінску. Працаваў загадчыкам кафедры беларускай літаратуры (1943—1952, 1955—1971), дэканам філфака (1944—1952, адначасова быў навуковым супрацоўнікам Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН Беларусі). Вучыўся ў дактарантуры Інстытута сусветнай літаратуры імя М.Горкага АН СССР (1952—1955). Чытаў лекцыі па беларускай літаратуры ў Варшаўскім (1958) і Сафійскім (1960) універсітэтах. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1939 г. Доктар філалагічных навук (1956), прафесар (1957). Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1971).

Як паэт дэбютаваў у 1930 г., як крытык у 1932 г. (першы артыкул, прысвечаны Віцебскай філіі «Маладняка», надрукаваны ў газеце «Віцебскі пралетарый»). Апублікаваў каля 180 літаратуразнаўчых прац, артыкулаў і рэцэнзій. У манаграфіях «На шляхах да рэалізму» і «Па шляху рэалізму» даследаваў праблемы станаўлення і развіцця рэалізму ў беларускай літаратуры XIX—пачатку XX ст. У даследаванні «Сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі суседніх славянскіх народаў у другой палове XIX ст.», зборніках артыкулаў «Славянская супольнасць», «Яднанне братніх літаратур» аналізаваў гістарычныя карані ўзаемасувязей беларускай літаратуры са славянскімі літаратурамі. Займаўся пытаннямі старажытнай беларускай літаратуры і фальклору, традыцый і наватарства. Даследаваў творчасць Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, П.Панчанкі і інш. Складальнік хрэстаматыі для сярэдняй школы «Родная літаратура», адзін з аўтараў дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры», «Беларуская вусна-паэтычная творчасць», «Старажытная беларуская літаратура», «Беларуская народна-паэтычная творчасць». Памёр 31.7.1981 г. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

*М.Р.Міхайлаў.*

*Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. Мн., 1994. Т. 4. С. 10.*

**ЛЯВОНЧЫКАЎ Васіль Емяльянавіч.** Доктар педагагічных навук, прафесар. Нарадзіўся ў 1937 г. у в. Бярозаўка Слаўгарадскага раёна. Пасля заканчэння сярэдняй школы каля 9 гадоў працаваў у раённым Доме культуры. У 1962 г. скончыў Мінскі педінстытут, працаваў на кафедры бібліяграфіі Беларускага інстытута культуры. У 1966—1968 гг. вучыўся ў аспірантуры пры Маскоўскім дзяржаўным інстытуце культуры. У 1969 г. абараніў кандыдацкую, потым доктарскую дысертацыі. Працуе загадчыкам кафедры агульнай бібліяграфіі Мінскага інстытута культуры. Пяру В.Е.Лявончыкава належаць звыш 50 навуковых работ, у тым ліку падручнік «Беларуская бібліяграфія», манаграфіі «Беларуская рэтраспектыўная бібліяграфія кніг» і «Сістэма бібліяграфічнай інфармацыі саюзнай рэспублікі». Ён упершыню распрацаваў курс «Беларуская бібліяграфія», падрыхтаваў яго праграму, метадычныя матэрыялы, напісаў дапаможнік па гэтай дысцыпліне. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

**МАРЧАНКА Іван Ягоравіч.** Член-карэспандэнт АН Беларусі (1980), доктар

гістарычных навук (1969), прафесар (1970). Нарадзіўся 2.6.1923 г. у в. Людкоў Слаўгарадскага раёна ў сялянскай сям'і. Скончыў Мінскі педінстытут (1950). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Радавым байцом, потым камандзірам аддзялення прайшоў дарогамі шасці франтоў, вызваляў Мінск, іншыя гарады Беларусі, Польшчу, ваяваў у Румыніі. Быў тройчы паранены. У 1945—1951 гг. на партыйнай рабоце. З 1952 г. у Інстытуце гісторыі АН Беларусі: малодшы навуковы супрацоўнік, вучоны сакратар, намеснік дырэктара па навуковай рабоце, загадчык сектара і аддзела, якія ўзначальваў больш за 30 гадоў. У апошнія гады працаваў галоўным навуковым супрацоўнікам інстытута. Унёс вялікі ўклад у развіццё беларускай гістарычнай навукі. Надрукаваў звыш 150 прац, у тым ліку 10 манаграфій і брашур, асноўныя з якіх прысвечаны гісторыі рабочага класа, калгаснага сялянства і культурнага будаўніцтва [«Аграрныя пераўтварэнні ў Беларусі ў 1917—1918 гг.», 1959; «Рабочы клас БССР у пасляваенныя гады (1945—1950)», 1962; «Працоўны подзвіг рабочага класа Беларускай ССР (1943—1950)», 1977; «Вядучая сіла. Рабочы клас Беларусі на этапе развітога сацыялізму», 1980, у сааўтарстве; «Беларусь—Літва: садружнасць памнажае сілы», 1985, у сааўтарстве; «Беларуская ССР: курсам перабудовы», 1989, у сааўтарстве]. Удзельнічаў у стварэнні буйных абагульняючых гістарычных прац — «Гісторыя Беларускай ССР» у 5 тамах (т. 3—5, 1973—1975), «Гісторыя рабочага класа Беларускай ССР» (т. 1—4, 1984—1987), «Нарысы гісторыі Беларусі» (ч. 2, 1995), у складанні «Хрэстаматыі па гісторыі БССР» (1962). Падрыхтаваў 18 кандыдатаў навук. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, трыма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Памёр 19.4.1997 г.

**МОЎНІН Міхаіл Савельевіч.** Доктар тэхнічных навук, прафесар. Нарадзіўся ў Слаўгарадзе. У 1923 г. скончыў Ліменскую вопытна-паказальную школу-камуну імя У.І.Леніна і паступіў у Ленінградскую лесатэхнічную акадэмію. Пасля яе заканчэння працаваў выкладчыкам у школе фабрычна-заводскага навучання ў Чэбаксарах, у школе авіяспецыялістаў, у



І.А.Прусаў.



А.А.Сёмкін.

Бросаўскім лесатэхнічным тэхнікуме. З 1933 г. выкладаў у Маскоўскім лесатэхнічным інстытуце, з 1936 г. на працягу 34 гадоў загадваў кафедрай у Ленінградскай лесатэхнічнай акадэміі імя С.М.Кірава. У ліку 160 навуковых прац прафесара М.С.Моўніна — дапаможнікі, манаграфіі, артыкулы па розных метадычных пытаннях. Некаторыя з іх выдадзены ў Англіі, Кітаі, Швецыі, Фінляндыі. Па задумках і пры актыўным удзеле М.С.Моўніна створана лепшая ў свеце машына для бесперабойнага прасавання дэталей са здробненай драўніны. М.С.Моўніну належыць першынство ў стварэнні тэарэтычных асноў прасавання драўніны метадам пракату і стварэння высакаякасных дэталей машын з малакаштоўных парод дрэва.

**ПРУСАЎ Іван Аляксеевіч.** Доктар тэхнічных навук (1968), доктар фізіка-матэматычных навук (1993), прафесар (1971). Нарадзіўся 11.6.1919 г. у в. Бярозаўка Слаўгарадскага раёна. У 1938 г. скончыў Слаўгарадскую СШ і паступіў на фізіка-матэматычны факультэт БДУ. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ў Чырвонай Арміі. У жніўні 1942 г. скончыў Тамбоўскае ваеннае кавалерыйскае вучылішча. Са снежня 1942 г. і да заканчэння вайны служыў у кавалерыйскім палку. У 1950 г. скончыў фізіка-матэматычны факультэт Львоўскага універсітэта. З 1972 г. па 1987 г. загадчык кафедры тэарэтычнай механікі, з 1987 г. прафесар кафедры тэарэтычнай механікі і робататэхнікі БДУ. Аўтар 4 манаграфій па праблемах тэрмапругкасці і тэорыі фільтрацыі вадкасці ў порыстых асяроддзях. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, медалямі. Памёр у 1994 г.



І.К.Цішчанка.

**СЁМКІН Аляксей Аляксандравіч.** Доктар біялагічных навук (1994), прафесар (1995). Нарадзіўся 23.2.1929 г. у в. Крамянка Слаўгарадскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1950 г. скончыў Слаўгарадскую СШ, у 1954 г. Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры. З 1957 г. працаваў асістэнтам, дацэнтам кафедры фізіялогіі і біяхіміі гэтага інстытута. У 1959 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1962 — 1970 гг. прарэктар па вучэбнай і навуковай рабоце, у 1977 — 1985 гг. рэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута фізічнай культуры. Сфарміраваў кірунак навуковых даследаванняў па фізіялогіі спорту, скіраваны на фізіялагічнае абгрунтаванне фізічных нагрузак пры падрыхтоўцы спартсменаў да спаборніцтваў, выяўленне механізмаў рэгулявання руху пры адаптацыі чалавека да напружанай спартыўнай дзейнасці. Аўтар 145 навуковых прац, у тым ліку 2 манаграфій, 8 вучэбнаметадычных дапаможнікаў і распрацовак. Узнагароджаны Граматай і Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, ордэнам «Знак Пашаны». Выбіраўся дэпутатам Мінскага гарадскога і раённага Саветаў.

**ЦІШЧАНКА Іван Кірылавіч.** Беларускі фалькларыст, літаратуразнавец. Кандыдат філалагічных навук (1969), прафесар (1994). Нарадзіўся 22.5.1930 г. у в. Улукі Слаўгарадскага раёна. Да вайны І.Цішчанка скончыў 3 класы Улуцкай пачатковай школы. У гады вайны за дапамогу партызанам быў схоплены карнікамі, цудам ратаваўся ад расстрэлу. Пасля вайны вучыўся ў Слаўгарадскай СШ, на філалагічным факультэце БДУ. У 1956 г. скончыў універсітэт і выкладаў мову і літаратуру ў Мінскім тэхнікуме харчовай прамысловасці (1956 — 1957). З моманту заснавання Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі (1957) працуе ў ім малодшым, а з 1971 г. старшым навуковым супрацоўнікам. З 1992 г. — дацэнт, загадчык кафедры фальклору Беларускага універсітэта культуры. У 1968 г. паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю. Штогод прымаў удзел у фальклорных экспедыцыях па зборы вуснай народнай паэзіі, удзельнічаў у падрыхтоўцы першага навуковага выдання «Беларускі эпас». Ім запісаны сотні твораў розных фальклорных жанраў.

Упершыню ў друку І.Цішчанка выступіў з фельетонам «Маўклівая размова» ў слаўгарадскай раённай газеце «Ленінскае слова» ў 1951 г. Пад псеўданімамі І.Улукскі і Ц.Цагельны выступаў у раённым друку з крытычнымі допісамі і фельетонамі. Першыя яго публікацыі па пытаннях фалькларыстыкі і гісторыі літаратуры ў рэспубліканскай перыёдыцы датуюцца 1956 г. Даследуе праблемы гісторыі беларускай фалькларыстыкі, жанры фальклору, міфалогію. З 1965 г. удзельнічаў у падрыхтоўцы шматтомнага акадэмічнага збору беларускага фальклору. Выдаў манаграфіі «Беларуская частушка. Пытанні генезісу жанру», «Жыццё песні», «Да народных вытокаў». У серыі БНТ падрыхтаваў тамы «Жартоўныя песні» (адбор, сістэматызацыя тэкстаў, уступны артыкул, каментарыі), «Песні пра каханне», «Сямейна-бытавыя песні», «Прыпеўкі», «Сацыяльна-бытавыя песні» (разам з В.Скіданам). Адзін са складальнікаў зборнікаў «Беларускія частушкі», «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны», «Паэзія змагання», сааўтар манаграфій «Беларуская народная вусна-паэтычная творчасць», «Беларуская фалькларыстыка». Адзін з аўтараў падручнікаў, дапаможнікаў, хрэстаматый і праграм па фальклоры для студэнтаў ВНУ рэспублікі. Аўтар літаратуразнаўчых і крытычных артыкулаў аб творчасці Л.Талстога, М.Горкага, А.Міцкевіча, А.Багдановіча, Т.Шаўчэнкі і інш., аб беларуска-руска-украінскіх сувязях, рэцэнзій на творы сучасных беларускіх пісьменнікаў. Займаўся даследаваннем аўтарства ананімнай гутаркі «Во цяпер які люд стаў». Яго пяру належыць апавяданне «Склезень» (Маладосць. 1988. № 4). Напісаў сцэнарыі дакументальных філь-

маў «Бывайце здаровы» (1981, пра А.Русака), «Песня на ўсё жыццё» (1986, пра Р.Шырму, сааўтар А.Ліс), «Вяртанне Міхася Забэйды» (1990, сааўтар П.Марчук). Выступаў з навуковымі дакладамі на розных міжнародных кангрэсах. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986, за ўдзел у падрыхтоўцы шматтомнага выдання «Беларуская народная творчасць»). Узнагароджаны Ганаровымі граматамі, медалём. Жыве ў Мінску.

**ЦІШЧАНКА Іван Рыгоравіч.** Член-карэспандэнт АН Беларусі (1974), доктар хімічных навук (1967), прафесар (1968). Нарадзіўся 25.2.1912 г. у в. Улукі Слаўгарадскага раёна ў сялянскай сям'і. Скончыў БДУ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1938 г. у БДУ: з 1953 г. дацэнт, з 1963 г. загадчык кафедры арганічнай хіміі, адначасова ў 1953—1965 гг. дэкан хімічнага факультэта. Аўтар прац па арганічнаму сінтэзу і рэакцыйнай здольнасці арганічных рэчываў. Распрацаваў метады сінтэзу поліфункцыянальных арганічных рэчываў, выявіў шэраг заканамернасцей рэакцыйнай здольнасці замешчаных ненасычаных злучэнняў у адносінах да малекулярнага кіслароду, перакісу вадароду і іншых акісляльнікаў. Сінтэзаваў ацыклічныя, карба- і гетэрацыклічныя злучэнні з некалькімі функцыянальнымі групамі, некаторыя з іх біялагічна актыўныя. Памёр 9.7.1987.

**ЯШКІН Іван Якаўлевіч.** Беларускі мовазнавец. Нарадзіўся 12.2.1932 г. у в. Шаламы Слаўгарадскага раёна. Кандыдат філалагічных навук (1970). Скончыў Васькавіцкую СШ (1950), Магілёўскі педінстытут (1954). У 1957—1959 гг. працаваў у Полацкім педагагічным інстытуце. З 1959 г. у Інстытуце мовазнаўства АН Беларусі, з 1977 г. старшы навуковы супрацоўнік. Правадзейны член Геаграфічнага таварыства беларускага філіяла пры АН Беларусі (з 1964). Даследуе беларускую дыялекталогію. Тэма кандыдацкай дысертацыі — «Слаўгарадскія гаворкі (Узаемадзеянне рознадыялектных сістэм)». Аўтар прац «Беларускія геаграфічныя назвы. Тапаграфія. Гідралогія» (1971), «Узаемадзеянне рознадыялектных сістэм. Фанетыка» (1979), «Узаемадзеянне рознадыялектных сістэм. Марфалогія. Сінтаксіс» (1980). Адзін са складальнікаў «Тлумачальнага слоўніка беларускай



І.Р.Цішчанка.



І.Я.Яшкін.

мовы» (т. 1—2, 1977—1978; т. 5, 1982), «Тураўскага слоўніка» (т. 1—4, 1982—1985). Браў удзел у зборы матэрыялаў для «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» (1963), «Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа» (1964—1974), зборы матэрыялаў, укладанні і выданні лінгвагеаграфічных артыкулаў «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» у 5 тамах (1971—1985 і да 1998). Удзельнічаў у выданні «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» («Раслінны і жывёльны свет», т. 1, 1993; «Сельская гаспадарка», т. 2, 1994; «Чалавек», т. 3, 1996; «Побыт», т. 4, 1997; «Семантыка. Словаўтварэнне. Націск», т. 5, 1998), а таксама ў зборы матэрыялаў і распрацоўцы навуковых тэм «Лінгвістычны атлас Еўропы» (1985—1990), «Усходнеславянскія ізаглосы» (1986—1991), «Слоўнік гаворак паўднёва-заходняй Віцебшчыны» (1986—1998), «Вывучэнне беларускіх, літоўскіх, польскіх і рускіх гаворак на тэрыторыі ўзаемадзеяння балтыйскіх і славянскіх моў» (1988—1990). Жыве ў Мінску.

## ДЗЯРЖАЎНЫЯ ДЗЕЯЧЫ

**БАРСУКОЎ *Якаў Нікандравіч.*** Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Нарадзіўся 5.11.1904 г. у в. Кульшычы Слаўгарадскага р-на. З 1932 г. на савецкай і гаспадарчай рабоце, з 1938 г. інструктар, сакратар Добрушскага РК КП(б)Б Гомельскай вобласці. Застаўшыся на акупіраванай ворагам тэрыторыі раёна, арганізаваў у жніўні—кастрычніку 1941 г. падпольную работу ў Добрушскім раёне. Са студзеня 1942 г. кіраўнік



А.У.Іваноўскі.



П.В.Вераб'ёў.

дыверсійнай групы, з чэрвеня камісар 2-й Беларускай партызанскай брыгады імя П.К.Панамарэнкі, а ў сакавіку—верасні 1943 г. — яе камандзір. Адначасова з чэрвеня 1942 г. да верасня 1943 г. Я.Н.Барсукоў выконваў абавязкі сакратара Мехаўскага падпольнага РК КП(б)Б. З 1943 г. на партыйнай і гаспадарчай рабоце. Памёр 29.9.1971 г.

**ІВАНОЎСКІ Аляксандр Уладзіміравіч.** Юрыст. Дзяржаўны саветнік юстыцыі, намеснік Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь. Нарадзіўся 28.10.1954 г. у Слаўгарадзе. У 1976 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ, у тым жа годзе стаў працаваць следчым, потым старшым следчым Маладзечанскай міжрайпракуратуры, намеснікам пракурора горада ў Барысаве. З 1983 г. у апараце Пракуратуры Рэспублікі Беларусь.

## ТВОРЦЫ

**БАРЫСЕНКА Валянцін Савельевіч.** Самадзейны кампазітар. Нарадзіўся ў 1926 г. у в. Барысавічы Клімавіцкага раёна. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ва ўзросце 15 гадоў пайшоў у партызаны, з 1943 г. і да канца вайны знаходзіўся ў Чырвонай Арміі. Удзельнічаў у баях на тэрыторыі Усходняй Прусіі. Пяць разоў быў паранены. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. З 1950 г. працаваў ў Слаўгарадскім раёне. Кіраваў гурткамі мастацкай самадзейнасці ў школах Слаўгарада, гарадскімі калектывамі мастацкай самадзейнасці. Аўтар музыкі песні «Слаўгарад наш». Да 50-годдзя Перамогі напісаў песні: «Успаміны ветэрана», «Вяртанне з перамогай», лірычную «Каля хаты, каля тыну». Памёр.

**ВЕРАБ'ЁЎ Павел Віктаравіч.** Беларускі паэт. Нарадзіўся 7.11.1958 г. у в. Рабавічы Слаўгарадскага раёна ў сям'і рабочага. Пасля заканчэння школы з 1976 г. да 1985 г. працаваў у слаўгарадскай раённай газеце карэспандэнтам, загадчыкам аддзела, намеснікам рэдактара. Адначасова ў 1977—1983 гг. завочна вучыўся на факультэце журналістыкі БДУ. У 1985—1987 гг. слухач Мінскай вышэйшай партыйнай школы. У 1987—1991 гг. рэдактар аддзела часопіса «Народная гаспадарка Беларусі», загадчык сектара друку ЦК ЛКСМБ, адказны сакратар газеты «Чырвоная змена», намеснік рэдактара газеты «Знамя юности», вядучы рэдактар выдавецтва «Юнацтва». З 1991 г. галоўны рэдактар газеты «Знамя юности», з 1992 г. намеснік галоўнага рэдактара газеты «Добры вечар», з канца 1994 г. аглядальнік газеты «Мінская праўда».

Літаратурную працу пачаў у 1976 г. Першыя вершы надрукаваў у слаўгарадскай раённай газеце. Публікаваўся ў магілёўскай абласной газеце, газетах «Чырвоная змена», «Сельская газета», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», часопісе «Маладосць». У 1990 г. у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў зборнік яго вершаў «Крытычная маса». П.Вераб'ёў — паэт з арыгінальнай манерай пісьма, сваім бачаннем свету, прыроджанай далікатнасцю. Піша пра родны край, яго людзей. Любоў да маці, роднай зямлі, вернасць запаветам продкаў — асноўныя матывы твораў. Лаўрэат прэміі імя М.Багдановіча выдавецтва «Мастацкая літаратура». Жыве ў Мінску.

*В.У.Смольская.*

*Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. Мн., 1995. Т. 6. С. 557.*

### СПАТКАННЕ З ДОМАМ

Я зноў гляджу на сцішаную вёску,
Ступаю на такі знаёмы шлях,
Што сэрца, нібы зробленае з воску,
Мякчэе — ачарсцвелае —
У грудзях.

І маці не ўстрымаць шчаслівых слоў...
Жыву я на зямлі, а не на небе,

Мяне турбуе згода землякоў,
Жыццё чыё — у бульбе, у хлебе.

Яны жывуць. Не плачуць аб пражытым.
Агонь надзеі ні ў адным не згас.
Які б ні страх, а ўсё-ткі сеюць жыта.
Спрадвеку жыта ратавала нас.

І я ля іх душой адратаваны,
Гляджу на свет смялей і весялей,
Бо ёсць каму загойваць нашы раны,
Жывуць і боль і вера у людзей.

Ніштo не затуманіць мой напрамак,
Не абарве вятроў дарожны спеў.
І будзе грэць уздых трывожны мамы:
«Ах, мой сынок, і шапкі не надзеў...»

* * *

Рабіны, рабіны, рабіны...
«На бульбу павінен быць год».
Дарогі сыходзяцца клінам
З захаду на ўсход.

Рабіны, рабіны, рабіны...
Журботны пагляд чысціні.
Дарогі, дарогі айчыны.
Тут мае карані.

Еду не госцем, а сынам,
Еду касіць і араць.
Рабіны, рабіны, рабіны
Абапал радзімы гараць.

**ГОМАНАЎ Аляксандр Міхайлавіч.** Беларускі архітэктар. Нарадзіўся 19 лістапада 1955 г. у Слаўгарадзе. У 1971—1975 гг. вучыўся ў Мінскім архітэктурна-будаўнічым тэхнікуме, у 1980—1986 гг. — у Беларускім політэхнічным інстытуце на аддзяленні архітэктуры. У 1975—1978 гг. служыў у Савецкай Арміі. З 1975 г. працаваў у Касцюковіцкім райвыканкоме Магілёўскай вобласці інжынерам-інспектарам дзяржаўнага архітэктурна-будаўнічага кантролю, архітэктарам у праектных інстытутах: Белкалгасбуд, Дзяржаўны праектны інстытут № 12, Ваенпраект. За гэты час быў аўтарам і сааўтарам шматлікіх будаўнічых аб'ектаў: Дом ваеннага адзення на вул. Я.Коласа, адміністрацыйна-бытавы корпус на вул. Лынькова, комплекс шматпавярховых жылых дамоў на вул. Сурганава і Бяды, гасцініца на вул. Трактарнай і інш. (г. Мінск), гасцініца (г. Рыга), 9—14-павярховыя жылыя дамы (г. Смаленск). Сумесна з турэцкай фірмай «Энка» прымаў удзел у праектаванні вайсковых жылых гарадкоў (г. Барысаў), з фінскай фірмай «Хакі» (г. Мар'іна Горка) і інш. Сказаў сваё важкае слова і ў мастацтве і ў рэстаўрацыі: у сааўтарстве зрабіў іканастас у в. Слабодка Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці, рэстаўрацыю касцёла ў г. Дзяржынск і пабудаваў плябанію.

### Шматгранны талент

Аляксандр Гоманаў — цікавы і таленавіты архітэктар. Ён сказаў сваё слова і ў такім новым жанры, як рэлігійнае мастацтва. Яго архітэктурныя творы ў Мінску, Смаленску, Барысаве, Рызе вабяць вока, адрозніваюцца навізной архітэктурнага мышлення, цудоўнай, рацыянальнай планіроўкай.

У 1995 г. А.Гоманаў па просьбе айца Мікалая (у міру М.У.Леднік, святар Дзяржынскай Святапакроўскай праваслаўнай царквы) зрабіў іканастас у Слабодскай царкве Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. Іканастас — яго першая адказная работа ў такім мастацкім жанры. І выканана ім старанна, цікава. У гэтую справу Гоманаў уклаў усю сваю душу, усё сваё архітэктурнае мастацтва. Царкву, якую ў нашы дні, дні шматлікіх перамен у жыцці і быце, пачалі аднаўляць аднавяскоўцы, упрыгожыў іканастас. З навакольных вёсак усяе акругі былі знесены абразы, усё царкоўнае начынне, шмат якія прадметы і абразы маюць вялікую каштоўнасць і зараз. Гоманаў усё гэта вывучыў, спланаваў, расставіў, і ў царкве стала ўтульна, прыгожа. Але самы цікавы абраз у царкве — цудатворны абраз Божай Маці, які ў час хрэснага ходу з г. Дзяржынска 21 ліпеня 1995 г. быў вернуты ў царкву, на яго законнае месца. І гэты цудатворны абраз Божай Маці ў сонме іншых абразоў заняў самае пачэснае месца. І ўсё гэта — стварэнне іканастаса, размяшчэнне абразоў у царкве — зрабіла пэўную ўтульнасць у царкве. Вернікі, якія ходзяць на набажэнствы, адчуваюць у царкве ўтульнасць і поўнасцю аддаюцца малебну Усявышняму. І яны часта з замілаваннем называюць імя Гоманава, які зрабіў многае для іх духоўнага адраджэння — уваскрэсення, прасвятлення іх душ, якія колькі дзесяцігоддзяў запар былі кінуты на волю лёсу. А зараз, у гэтай святыні, іх душы святлеюць, робяцца ўзнёслымі, яны рады, што дзякуючы магічным рукам Аляксандра могуць быць у сваёй святыні.


А.М.Гоманаў.


Л.М.Гоманаў.

Аляксандр Гоманаў шмат часу аддаў і рэстаўрацыі другой святыні грэка-каталіцкай веры — касцёлу Святой Ганны (бабкі Ісуса Хрыста) у г. Дзяржынск Мінскай вобласці. Адзін са старэйшых касцёлаў на Беларусі (у дакументальных крыніцах вядомы з 1439 г.), ён прайшоў усе выпрабаванні савецкага часу — у свой час у ім быў склад, потым клуб, пазней — музычная школа. А зараз стаў адноўлены, абноўлены і знешне, і знутры. І тут Гоманаў уклаў сваё ўменне і свае залатыя рукі.

Вось такія грані таленту прачнуліся ў А.Гоманава дзякуючы новаму часу, які надышоў пасля таго, як была скінута завеса забароны на ўсе духоўныя праяўленні чалавека.

*А.І.Валахановіч.*



Плакат Л.Гоманава

**ГОМАНАЎ Леанід Міхайлавіч.** Беларускі мастак у галіне жывапісу, кніжнай графікі, плаката. Нарадзіўся 22 лістапада 1953 г. у Слаўгарадзе. Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча імя А.К.Глебава (1974), Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (з 15 лістапада 1991 г. — Беларуская акадэмія мастацтваў, 1991). Пасля заканчэння мастацкага вучылішча працаваў мастаком-афарміцелем у Пухавіцкім раённым Доме культуры, МВА імя У.І.Леніна, універмагу «Беларусь» у Мінску. З 1991 г. працуе ў рэдакцыі мастацкага афармлення выдавецтва «Навука і тэхніка», зараз — вядучы мастацкі рэдактар выдавецтва «Беларуская навука».

Удзельнік рэспубліканскіх, усесаюзных і міжнародных выставак і конкурсаў. Член Беларускага саюза мастакоў (1991).

Леанід Гоманаў — аўтар жывапісных палотнаў «Максім Багдановіч» (1981), «Мой родны кут» (1982), «Восень у Люцынцы» (1983) і інш. Плённа працуе мастак у жанры плаката. Тэмы яго работ самыя актуальныя: яго хвалююць праблемы экалогіі («Чарнобыль 26.4.86», 1988; «Дапамажы дзецям чарнобыльскай зоны», 1990; «За экалогію», 1990, і інш.), сацыяльныя пытанні («Хто адкажа?», 1990, «Бракаробу», 1985; «Бюракрату», 1986; «Каковы труды, таковы и плоды», 1987; «Остановить гонку вооружений», 1984; «Почему голод? Почему нищета?», 1986, і інш.).

Вялікі ўклад зроблены мастаком у адраджэнне беларускай нацыянальнай культуры. У 1991 г. ён стварыў серыю каляровых плакатаў «Беларускія асветнікі», прысвечаную знакамітым асобам беларускай зямлі. Гэта Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Мікола Гусоўскі, Францыск Скарына і Сімяон Полацкі.

Л.Гоманаў — аўтар плакатаў да мастацкіх кінастужак «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1989) і «Сівая легенда».

Яму належыць звыш 50 работ у галіне кніжнай графікі. Узнагароджаны дыпломамі на рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах плаката і кніжнай графікі.

Творы Леаніда Гоманава знаходзяцца ў Нацыянальным музеі Беларусі, музеі Якуба Коласа, прыватных калекцыях Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі і Францыі.

**КІРЭЕНКА Кастусь** (Канстанцін Ціханавіч; псеўданім Пятрусь Дубец). Беларускі паэт, празаік, публіцыст, перакладчык. Нарадзіўся 12.12.1918 г. у в. Гайшын Слаўгарадскага раёна ў сялянскай сям'і, рана далучыўся да працы вяскоўцаў. Матэрыяльныя цяжкасці вымушалі бацьку і сына наймацца ў пастухі, тры гады пасвіць вялікі статак кароў. Нягледзячы на беднасць, бацькі рабілі ўсё магчымае, каб даць сыну адукацыю. Першым настаўнікам К.Кірэенкі быў бацька, які прывіў сыну любоў да прыроды і роднага краю, навучыў чытаць, далучыў да скарбаў народнай творчасці. У школьныя гады вялікі ўплыў на падлетка аказаў настаўнік літаратуры І.Е.Марчанка, які абудзіў у сваім вучню творчыя здольнасці. У 1934 г. Кастусь скончыў сямігодку ў в. Гайшын і паступіў у Гомельскі аўтадарожны тэхнікум, дзе правучыўся толькі адзін год. У 1935 г. паступіў на літаратурны факультэт Гомельскага педінстытута. Усё акружэнне ў інстытуце, паводле слоў паэта, атмасфера, усе думкі з першага дня вучобы былі скіраваны ў бок творчасці. Пасля заканчэння інстытута (1940) ён некалькі месяцаў выкладаў мову і літаратуру ў Гарадзецкай сярэдняй школе Быхаўскага раёна. Восенню таго ж года прызваны ў рады Чырвонай Арміі. Да ліпеня 1941 г. вежавы стралок у танкавым экіпажы, затым да сакавіка 1945 г. карэспандэнт баявога аддзела армейскай газеты «За Родину» на Заходнім і 2-м Беларускім франтах. Удзельнічаў у абароне Масквы, у вызваленні Беларусі, Польшчы. Быў цяжка паранены. Пасля дэмабілізацыі ў 1945 г. загадваў аддзелам літаратуры і мастацтва ў часопісе «Беларусь», з 1962 г. галоўны рэдактар часопіса «Бярозка», у 1972 — 1986 гг. галоўны рэдактар часопіса «Полымя». У 1980 — 1985 гг. дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. У 1969 г. у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XXIV сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1943 г. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі «Знак Пашаны», Ганаровымі граматамі Вярхоўных Саветаў БССР, ЛітССР і ЛатССР, медалямі. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1970). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я.Купалы (1972, за «Кнігу ста песень»), Літаратурнай прэміі імя Я.Купалы (1964, за кнігу «Смага»).



К.Ц.Кірэенка.

Першы верш К.Кірэенкі «Радзіма» з'явіўся ў 1939 г. на старонках «Гомельскай праўды», у тым жа годзе яго паэтычныя творы змясцілі часопіс «Полымя рэвалюцыі» і газета «Літаратура і мастацтва». Першы зборнік вершаў «Ранак ідзе» (1945) прысвечаны пераважна баявым будням савецкага воіна, які пракладаў штыком шлях да перамогі. У пасляваенных зборніках «Пасля навальніцы» і «Мая рэспубліка» выразна акрэсліліся грамадзянска-патрыятычнае гучанне, публіцыстычны пафас у спалучэнні са шчырасцю пачуцця, з мяккім лірызмам. З цягам часу творчая эвалюцыя К.Кірэенкі ўсё больш скіроўвалася ў бок філасафічнасці, паглыбленага псіхалагізму, лірызацыі («Кніга ста песень», «Сіні вырай», «Вёсны веснавацъ», «Дэкрэтам сэрца», «Надзея»). Асаблівай філасофскай напоўненасцю, выключнай сілай эмацыянальнага ўздзеяння вызначаецца арыгінальная, наватарская ліра-эпічная паэма К.Кірэенкі «Трыпутнік». Аўтар твораў для дзяцей (паэма «Алёнчына школа», зборнікі вершаў «Зялёнае рэха», «Вясна-красна», «Урачыстая песня» і іншыя). На вершы К.Кірэенкі напісалі песні М.Аладаў,

У.Алоўнікаў, У.Буднік, І.Кузняцоў, С.Палонскі, Ю.Семяняка і іншыя. Памёр 15.9.1988 г. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску. На доме ў Мінску, дзе ў 1977—1988 гг. жыў пісьменнік, у 1991 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

*А.С.Гурская, Я.К.Усікаў.*

*Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. Мн., 1994. Т. 3. С. 234.*

**ПАХ ЧАБАРОВЫ**

Не прыдумаю сама,
Што са мной здарылася:
З працы сёння йшла дамоў
І з дарогі збілася.

Мне б ісці каля ракі.
Я ж пайшла дубровай,
Галаву маю кружыў
Пах чабаровы.

Я ішла ўсё ды ішла,
Аж пакуль сумелася.
І не ведаю сама,
Як з Ігнасем стрэлася.

А Ігнась жа — ён са мной
Ды такі суровы....
Не кружы ты галавы,
Пах чабаровы!

Хлопец глянуў на мяне —
Я аж здрыганулася.
Але што са мной? Чаму
Да яго схінулася?

І чаму так мілы мне
Прывітання словы?
Кружыць, кружыць галаву
Пах чабаровы!..

Неба ззяла над зямлёй
Яркай вечарніцаю.
Доўга мы сядзелі з ім,
З любым, над крыніцаю.

Толькі ціхія дубы
Чулі нашы змовы...
Ой, вясна мая, вясна,
Пах чабаровы!

Што скажу матулі я,
Як часінай позняю
Я з'яўлюся перад ёй,
Ласкавай і грознаю?

Што скажу, схаваю як
Водар той дубровы?
Я ж у хату прынясла
Пах чабаровы...

1954 г.

**БЕЛАЯ ЧАЙКА**

В.П.

Прычапілася белая чайка ка мне:
Не паспею заснуць — а яна нада мною.
Кружа, кружа — то вострым крылом чыркане,
То, як хваляй гарачай, абдасць белізною.

І крычыць, і крычыць так тужліва штораз!
І глядзіць, і глядзіць. А пагляд — дзікаваты.
Быццам нейкі таемны вядомы ёй сказ.
Быццам я перад ёю у чымсь вінаваты.

Я прачнуся. Я доўга нямею ў цішы.
Ты адкуль, мая чайка? Адкуль ты і што ты?
Я ж за век аніводнае чыстай душы
Не забіў — ні ў людзей на вачах і ні ўпотай.

Тыя ж душы, якія паліў я агнём,
Былі з чорнае зграі, цямнейшыя ночы.
І яны аніколі ні ноччу, ні днём
Не схацелі б папасца ізноў мне на вочы.

Дык адкуль жа ты, чайка? Адкуль і чыя?
І чаго ты чакаеш? — скажы, калі можна...
... А, быць можа, ты тая трывога мая,
З якой колісь расстаўся я неасцярожна?

Можа быць, ты заўважыла ў песнях маіх
Вельмі чыннасці многа і многа спакою?
І, мне ўсё даравяўшы, прыйшла, каб да іх
Зноў вярнулася скруха за шчасце людское?

Не адказвае чайка... А я не магу
Жыць далей так, як жыў, — каб і ўтульна і сонна...
Быццам хтосьці па свеце збірае тугу
І нясе ў маё сэрца — штоноч і штодзённа.

Нейкі кліч, нейкі звон усяліўся ў мяне,
Як хто водзіць па жылах смычком-самайграйкай.
А ледзь вочы самкну — зноў крылом чыркане,
Зноў крычыць нада мной мая белая чайка.

1961 г.

**КУЗЬМЯНКОЎ Уладзімір Іванавіч.** Беларускі празаік, публіцыст. Нарадзіўся 27.6.1936 г. у в. Устаннае Слаўгарадскага раёна ў сям'і калгаснікаў. Дзяцінства і юнацтва прайшлі ў роднай вёсцы. Пасля заканчэння Рабавіцкай сярэдняй школы (1955) працаваў у калгасе. У верасні 1955 г. прызваны ў Савецкую Армію. Служыў у Ваенна-Паветраных войсках. Пасля звальнення ў запас працаваў рознарабочым на будаўніцтве Ніжнерасцянскай ГЭС, адказным сакратаром казлоўшчынскай раённай газеты «Сцяг перамогі». У 1958 г. паступіў на аддзяленне журналістыкі БДУ, затым працаваў літсупрацоўнікам, загадчыкам аддзела, адказным сакратаром у рэдакцыі

газеты «Чырвоная змена». З 1971 г. адказны сакратар часопіса «Политинформатор и агитатор», з 1974 г. загадчык аддзела, адказны сакратар рэдакцыі газеты «Звязда», з 1980 г. рэдактар «Настаўніцкай газеты», з 1987 г. намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Беларуская мова і літаратура ў школе», са снежня 1987 г. старшы навуковы супрацоўнік Мінскай ВПШ, з 1991 г. галоўны рэдактар газеты «Медицинский вестник». Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1974 г. Кандыдат гістарычных навук. Узнагароджаны медалём, Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Першы нарыс У.Кузьмянкова надрукаваны ў газеце «Звязда». Як апавядальнік на старонках рэспубліканскага друку выступіў у 1966 г. (апавяданні «Бацька» і «Мікіта-чалавек»). У 1972 г. выйшла яго першая кніга апавяданняў «Ішла вясна», дзе паказана пасляваеннае дзяцінства, станаўленне маладога чалавека. Працуючы доўгі час у маладзёжным друку, бываючы па заданнях рэдакцый на будоўлях, у саўгасах і калгасах, выступаў са шматлікімі артыкуламі і нарысамі, прысвечанымі жыццю і працы нашай моладзі. У сваіх мастацкіх творах аддае перавагу надзённай тэматыцы, у натуральнай і даверлівай манеры апавядае пра шчырасць юнацкага пачуцця, пра светлае ў чалавечай душы. Яго кніга «Услаўляючы дружбу народаў» прысвечана праблемам міжнацыянальных адносін, эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва. Жыве ў Мінску.

*А.С.Гурская, З.А.Суднік.*

*Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. Мн., 1994. Т. 3. С. 447—448.*

**МАСАРЭНКА Алесь** (Аляксандр Герасімавіч). Беларускі празаік, перакладчык. Нарадзіўся 12.4.1938 г. у в. Ходараў Слаўгарадскага раёна ў сям'і калгаснікаў. У 1956 г. скончыў Целяшоўскую СШ, працаваў інструктарам Слаўгарадскага райкома ЛКСМБ (1956—1957), служыў у Савецкай Арміі (1957—1960). Скончыў БДУ (1966). Працаваў выхавацелем мінскай школы-інтэрната № 13 (1963—1966), рэдактарам аддзела беларускай літаратуры Камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачанні СМ БССР (1966 — 1967), загадчыкам аддзела літаратуры і мастацтва газеты «Чырвоная змена» (1967), інструктарам па прамысловым адлове рачнога бабра Літоўскага заацэнтра (1967—1968), літсупрацоўнікам газеты «Літаратура і мастацтва» (1968—1969), загадчыкам рэдакцыі дзіцячай літаратуры выдавецтва «Беларусь» (1969—1972), адказным сакратаром часопіса «Полымя» (1972—1974), рабочым у геалагічнай экспедыцыі Забайкалля (1974—1978), рэдактарам аддзела прозы часопіса «Маладосць» (1977—1978), членам сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм» (1978—1982), загадчыкам аддзела крытыкі і літаратуразнаўства часопіса «Полымя» (1982—1986). З 1986 г. рэдактар выдавецтва «Юнацтва». Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1972 г. Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР.



У.І.Кузьмянкоў.



А.Г.Масарэнка.

Літаратурную дзейнасць пачынаў з вершаў, якія ўпершыню апублікаваў у 1959 г. Першае апавяданне надрукавана ў 1962 г. У цэнтры ўвагі пісьменніка — праблемы сучаснасці, экалагічныя (аповесць «На бабровых тонях»), маральна-этычныя пытанні (кніга прозы «Журавіны пад снегам»). Аўтар рамана «Баргузінскае лета», прысвечанага будаўніцтву Байкала-Амурскай магістралі. Піша нарысы, апавяданні, прысвечаныя надзённым пытанням. Жыве ў Мінску.

*Л.С.Савік.*

*Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. Мн., 1994. Т. 4. С. 241.*

**НЯМІЛЕНЦАЎ Міхаіл Фёдаравіч.** Нарадзіўся ў 1920 г. у в. Рудня Васькавіцкага сельсавета Слаўгарадскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі пра-



М.Ф.Няміленцаў (франтавы здымак).



В.А.Ракаў.

цаваў начальнікам Слаўгарадскага райзематрада, выкладчыкам чарчэння і малявання ў школах Слаўгарада. Скончыў завочна Маскоўскі мастацкі інстытут. Як мастак перадаваў сваё майстэрства навучэнцам 1-й і 2-й школ горада, вёў метадычную работу сярод настаўнікаў чарчэння і малявання. У слаўгарадскай СШ № 2 больш за 20 гадоў кіраваў гуртком выяўленчага мастацтва. Многія яго выхаванцы сталі мастакамі і скульптарамі. Выстаўкі юных мастакоў — вучняў М.Ф.Няміленцава — дэманстраваліся ў Слаўгарадзе, іншых гарадах Магілёўшчыны. Работы іх экспанаваліся на абласных, рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках у Балгарыі, Японіі. Пра юных гуртко ўцаў М.Ф.Няміленцава Мінскай тэлестудыяй быў зняты дакументальны фільм. Міхаіл Фёдаравіч з'яўляецца аўтарам помнікаў Героям Савецкага Саюза В.І.Чамадураву і П.Ц.Панамарову. М.Ф.Няміленцаў узнагароджаны знакам «Выдатнік народнай асветы». Памёр у 1985 г.

**РАКАЎ Віктар Афанасьевіч.** Беларускі паэт. Нарадзіўся 22.1.1935 г. у в. Целяшы Слаўгарадскага раёна ў сям'і калгаснікаў. У час вайны будучаму паэту давялося пабачыць усе жахі жыцця на акупіраванай тэрыторыі. Летам 1943 г. вёска была вызвалена, і В.Ракаў пачаў вучыцца. Скончыў Целяшоўскую СШ (1953), фізіка-матэматычны факультэт Магілёўскага педінстытута (1958), Мінскую вышэйшую партыйную школу (1971). Настаўнічаў у Целяшоўскай (1958—1960), Рэчкаўскай (1960—1965) сярэдніх школах на Магілёўшчыне. Працаваў карэспандэнтам-арганізатарам Магілёўскага раённага радыёвяшчання (1965), загадчыкам сельскагаспадарчага аддзела шклоўскай раённай газеты «Ударны фронт» (1965—1969), літсупрацоўнікам газеты «Звязда» (1969—1975), рэдактарам аддзела публіцыстыкі часопіса «Полымя» (1975—1982). З 1982 г. адказны сакратар часопіса «Полымя». Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1979 г. Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Літаратурнай дзейнасцю В.Ракаў пачаў займацца ў студэнцкія гады. Першы верш надрукаваў у 1956 г. у газеце «Магілёўская праўда». Паэзія В.Ракава прысвечана вёсцы, бацькоўскай зямлі, сялянскай працы (зборнікі «Вернасць», «Акно ў зялёны сад»). Піша пра пераемнасць пакаленняў («Пазыўныя», «Песня і памяць», «І сноп, і птах, і я»), гераізм нашых людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, захапляецца прыгажосцю прыроды, кахання. Праз усю творчасць паэта праходзіць шчымлівая тэма любові да Радзімы, сыноўняй вернасці Магілёўшчыне, дарагому сэрцу Прысожжу. У паэмах «Хлеб», «Я — «Рубін!» — «Прыём!..», «Лебядзіная песня» (апублікаваны ў зборніках) узняты надзённыя праблемы сучаснасці. Піша таксама нарысы, крытычныя артыкулы, рэцэнзіі. Жыве ў Мінску.

*Л.С.Савік.*

*Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. Мн., 1995. Т. 5. С. 132.*

**ТРАСЛІЎКА**

Стаяла вёсачка.
Жыла руплівую.
А ў ёй — рупліўцы.
Паштовы адрас быў.
Была Трасліўка.
Былі трасліўцы.

Лес падступаў да стрэх.
Сасну з ялінаю
Вёў на падворак.
Вакол — Маліннае,
і Жураўлінае,
і Чарнаборак.

Стаяла вёсачка —
З плугамі, з сеўнямі.
Звінелі хаты.
Перакліканіся
Салоўкі з пеўнямі.
Трубілі сахаты.

Сады кашлатыя —
Наліў, антонаўка.
А ў лесе — дзічкі.
Вядро над студняю.
На лозе — конаўка
Каля крынічкі.

Ды хтосьці вёсачцы,
Як нож, кляймо ўсадзіў,
Неперспектыўнай.
І — ні дарог сюды,
Ні праваоў сюды,
Ні магазінаў...

...Праз колькі год я зноў
Прайшоў мясцінамі —
Паклікаў жораў —
Ад Салаўінага
Да Жураўлінага
На чыйсь падворак.

Ад цвілі, сырасці
(Знаць, выпаў час такі)
Запухлі дзверы.
Ні ў сенцах зашчапкі,
Ні ў пуні ластаўкі.
След — лапы звера.

Пустэльна, вусцішна.
Душа маркоціцца.
З кім прывітацца?
...Ніхто ніколі ўжо
Тут не народзіцца —
Трасліўцам звацца.

1984 г.

**РУБАНАЎ Уладзіслаў Якаўлевіч.** Беларускі празаік. Нарадзіўся 15.12.1952 г. у в. Аляксандраўка-1 Слаўгарадскага раёна ў сям'і настаўніка. Скончыў Аляксандраўскую васьмігодку, Слаўгарадскую СШ (1970). Вучыўся на факультэце журналістыкі БДУ (1970—1975). З 1975 г. працаваў карэспандэнтам, адказным сакратаром старадарожскай раённай газеты «Поступ Кастрычніка», з 1978 г. у аддзеле прозы часопіса «Полымя», з 1986 загадчык рэдакцыі прозы выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1982 г.

У друку У.Рубанаў выступаў з 1972 г. Стала творчай працай пачаў займацца з 1976 г. У 1981 г. выйшла першая кніга прозы «Вокны без фіранак». Яго аповесці («Каштаны», «Грыбавар», «Разам па жыцці») і апавяданні заснаваны на сучасным матэрыяле. Асабліва празаіка цікавілі маральна-этычныя і сацыяльна-псіхалагічныя аспекты жыцця вёскі і горада, духоўны свет сучасніка, праблема вясковага чалавека ў горадзе. Пісьменнік адчуваў небяспеку духоўнага Чарнобыля («Замах»), імкнуўся паказаць лепшыя традыцыі сялянскага побыту, сцвярджаў высокастаноўчыя рысы характару вяскоўцаў старэйшага пакалення: працавітасць, гаспадарлівасць, любоў і прыхільнасць да зямлі, прыроды. Стварыў паэтычны вобраз Мінска ў аповесці «Каштаны». Аўтар рамана «Не аднойчы забіты» (Маладосць. 1994. № 1—2). Памёр 21.7.1994 г.

*Л.С.Савік.*

*Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. Мн., 1995. Т. 5. С. 156—166.*

**РЫЖАНКОВА Людміла Іванаўна.** Журналістка. Нарадзілася 18.9.1955 г. у в. Рабавічы Слаўгарадскага раёна ў сям'і настаўнікаў. Пасля заканчэння школы з 1974 г. да 1982 г. працавала ў слаўгарадскай раённай газеце загадчыкам аддзела, адказным сакратаром, намеснікам рэдактара. У 1980 г. завочна скончыла факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, у 1984 г. — Мінскую вышэйшую партыйную школу. Працавала намеснікам рэдактара шклоўскай райгазеты, з 1986 г. — у «Звяздзе»: карэспандэнт, загадчык аддзела, палітычны аглядальнік, з 1991 г. — намеснік галоўнага рэдактара. Лаўрэат прэміі Беларускага саюза журналістаў. Жыве ў Мінску.

**АСАБІСТАЕ**

**Не страляйце ў светлы помнік!**

У паміраючай маёй вёсцы ён кожны раз сустракае мяне першым. Задрэмле, нагаміўшыся, мама, забавіцца за бясконцымі справамі бацька, а ён прыветна, нязменна і нястомна свеціць светлаю сваёю паставай — белы помнік на шэра-сталёвым фоне.

Тонкі профіль, просты адкрыты твар — зусім юны, спакойна-чысты, быццам многа-многа наперадзе добрага, шчаслівага, светлага. Таго, на што ўсе мы разлічваем, ідучы ў жыццё.

Страшна нават уявіць, што станецца з гэтым тварам, з гэтай юнай душою, маладым целам літаральна праз некалькі месяцаў. Светлы помнік перад маім домам — не бязлікі стандартна-халодны манумент воіну-вызваліцелю, якія мы так любім узводзіць паўсюдна. Тут, у Рабавічах, на-



У.Я.Рубанаў.



Л.І.Рыжанкова.

заўсёды застаўся Панамароў Пётр Ціханавіч, 1924 года нараджэння. Летам сорак першага яму споўнілася семнаццаць. У дзевятнаццаць ён стаў Героем. Пасмяротна.

У кароткай энцыклапедычнай даведцы ўся яго біяграфія ўмясцілася ў адзінаццаць радкоў. Ды і там — найбольш пра колькасць «адбітых танкавых атак праціўніка...».

Толькі пакахаўшы, разумееш усю трагедыю няспраўджаных, жорстка адабраных надзей, па-жывому адарваных адно ад аднаго сэрцаў.

Толькі нарадзіўшы дзіця, разумееш, як страшна, безвыходна — да немага крыку — яго губляць.

Толькі адчуўшы — не свядомасцю, а нечым самым глыбокім, трывожна-сумным у душы — тую непазбежную мяжу, што адбярэ самых дарагіх людзей, уяўляеш боль ад дачасных страт.

Вайна забівала іх тысячамі і мільёнамі — каханых, дзяцей, бацькоў. Ці жыве ў нас хоць маленькая часцінка жывога і глыбокага — не параднага, не аблітага шматколернасцю салютаў — разумення народнай, нацыянальнай, чалавечай трагедыі?

...Перад святам Перамогі выбралася на высокі бераг хуткай і плыннай Проні — туды, дзе трымаў апошнюю абарону юны артылерыст Пётр Панамароў. За паўвека не вылечылася зямля — спаласавана ўдоўж і ўпоперак траншэямі, акопамі, зямлянкамі: фронт стаяў тут двойчы, у сорак першым і ў сорак трэцім. Але на гэты раз не пазнала знаёмых мясцін: усё перакапана. Хлапчукі шукалі снарады і порах... Страшны занятак, але не менш страшным было і другое: побач з пустымі гільзамі ад снарадаў і патронаў рассыпаліся чалавечыя косткі. Чарапы. Каскі — нашы, з чырвонай зорачкай. Хлапчукам яны аказаліся непатрэбнымі. Хлапчукам гуляць у вайну. Слухаць у школе пра подзвіг і патрыятызм. Мы расцём патрыётамі. Мы расцём патрыётамі?

Пятра Панамарова расстрэльвалі неаднойчы. Забіваць яго пачалі ў 37-м, калі пад сваімі кулямі ляглі тыя, хто мог навучыць прафесіянальнаму воінскаму майстэрству зусім яшчэ хлапчука, выпраўленага супраць жалезнай моцы ворага, хто мог таленавіта распарадзіцца сілай наяўнай зброі і ваеннай тактыкі. Потым яго расстраляў фашыст.

Ці не расстрэльвае і хто-ніхто з нас — неразуменнем, заклікамі да пераасэнсавання вайны? Што пераасэнсоўваць старэнькім мацяркам, якія аддалі вайне сваіх хлопчыкаў? Ці састарэлым прыгажуням, якія так і не дачакаліся з фронту суджаных, засталіся векавухамі?..

Пётр Панамароў абараніў наш край. Сваёй зямлі мы не збераглі самі — злым палыновым попелам засыпала яе ўсю, да апошняй пядзі, чорная красавіцкая навала 86-га. Галовы жывых і магілы мёртвых. Юны артылерыст сваім жыццём і сваёй узвышанай смерцю паказаў нам: слабых ва ўсе часіны трэба абараняць. Ці паступіць моцная дзяржава гэтак жа высакародна да абдзеленых лёсам — каторы раз! — сваіх грамадзян? Вось у чым твае ўрокі, Пятро. Бо тыя хлапчукі, якіх упарта ахопліваюць патрыятычным выхаваннем, і самі аказаліся безабароннымі перад бядою.

Дзесьці будуць сёння шматтысячныя ўрачыстасці, жалобныя мітынгі. З'едзецца свет у слаўны наш Брэст, асвеціцца салютам гераічны Мінск. Ім пашанцавала болей — знайшліся таленавітыя пісьменнікі, што прапусцілі людскія лёсы і боль праз свае душы, зрабілі герояў бліжэй да нас. А Магілёў? А сотні вялікіх і маленькіх нашых райцэнтраў, безліч высотаў?

... Я еду на сваю Слаўгарадчыну, да сціплага помніка на ўскрайку поля. Ён зноў сустрэне мяне першым — рускі хлопец з далёкай Волгі. Чысты твар, ясныя вочы, адкрытае да дабрыні сэрца. Паглядзіце, людзі: гэта мы перад сорак першым...

*Людміла Рыжанкова.*

*Звязда. 1991. 22 чэрв.*



М.Стральцоў.

**СТРАЛЬЦОЎ Міхась** (Міхаіл Лявонавіч). Беларускі празаік, паэт, перакладчык, крытык. Нарадзіўся 14.2.1937 г. у в. Сычын Слаўгарадскага раёна ў сям'і сельскага настаўніка. У 1954 г. скончыў Наваельненскую сярэднюю школу (Краснапольскі раён), у 1959 г. — аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. Працаваў у рэдакцыях газеты «Літаратура і мастацтва» (1959–1961), часопісаў «Полымя» (1961–1962), «Маладосць» (1962–1968). У 1968–1983 гг. на творчай рабоце. У 1983 г., незадоўга да заўчаснай смерці, стаў загадчыкам аддзела крытыкі часопіса «Нёман». Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1962 г. Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я.Купалы (1988, пасмяротна, за кнігу вершаў «Мой свеце ясны»).

Пачаў пісаць у школьныя гады. Яго першыя вершы на рускай мове былі змешчаны ў вучнёўскім рукапісным часопісе «Прамень» (1952), потым з'явіліся ў раённай газеце «Калгасны шлях» (1965). Першае апавяданне «Дома» надрукаваў у 1957 г. у часопісе «Маладосць» (№ 1). У 1962 г. выйшла першая кніга яго апавяданняў «Блакітны вецер». Яна звярнула на сябе ўвагу чытачоў, крытыкі, грамадскасці здольнасцю аўтара пранікаць ва ўнутраны свет сваіх персанажаў, зацікаўленасцю маральна-этычнай праблематыкай. Аднак сапраўдную славу прынеслі пісьменніку зборнік апавяданняў «Сена на асфальце» (1966), аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь» (1970), якія вызначаюцца веданнем жыцця, наватарскім падыходам да адлюстравання рэчаіснасці, арыгінальнасцю творчых пошукаў і знаходак. Аўтар удала спалучае бытавое, будзённае, зямное з узнёслым, рамантычным, у выніку чаго знаходзяць своеасаблівы сплаў проза і паэзія жыцця. Адначасова з празаічнымі творамі М.Стральцоў пісаў лірычныя вершы, поўныя роздуму і глыбокага пачуцця, нярэдка пабудаваныя на асацыятыўнай аснове (зборнікі «Ядлоўцавы куст», «Цень ад вясла»). Вядомы як перакладчык на беларускую мову твораў рускіх, украінскіх, італьянскіх, іспанскіх, лацінаамерыканскіх паэтаў — А.Пушкіна, М.Браўна, Н.Гільена, П.Нэруды, Я.Смелякова, рамана Ч.Айтматава «Заветны паўстанак» (1985), прозы Л.Лявонава, Б.Пастэрнака і іншых. Разам з В.Раеўскім напісаў сцэнарый тэлеспектакля «Па шчасце, па сонца» (паводле дарэвалюцыйных твораў Я.Купалы). Усеагульным прызнаннем карыстаўся М.Стральцоў і як таленавіты крытык і літаратуразнавец. Яго праблемныя артыкулы па пытаннях літаратуры і мастацтва, што змяшчаліся ў перыядычным друку, эсэ, творчыя партрэты, якія ўвайшлі ў кнігі «Жыццё ў слове», «У полі зроку», адпавядаюць высокім ідэйна-эстэтычным крытэрыям сучаснасці. Памёр 23.8.1987 г. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

*Я.К.Усікаў.*

*Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. Мн., 1995. Т. 5. С. 426.*

**ЗАСЦЯРОГА**

Калі маўчыць душа, гібее розум наш,
Як дрэва без вады ці як вятрак без ветру.
Жыццё лічы на дні альбо на кіламетры —
Вакол цябе адно панылы антураж.
І ўсё, што словам ты не назавеш,
Маўчыць, як цішыня ці як вятрак без ветру,
І не даецца сэнс, нібы руцэ паветра.
Калі душа маўчыць, не гаварыце лепш.

1972 г.

**БАЦЬКАЎШЧЫНА**

З двара прыйду і сяду ля агню.
Палаюць дровы. Ссечана капуста
На градах — блаславенне дню.
Змрок у палях — там сіберна і пуста.
Узыдзе месяц позна. На парог
Я ноччу выйду. У нямым здранцвенні
Паветра, далеч. Серабрыцца лог
За сажалкай — на ім снуюцца цені.
О роднае маё! Як доўга да цябе
Ішоў я, кволы падарожнік.
О весялосць у восеньскай журбе!
Агонь. Саган.
Вуголле і трыножнік.

1981 г.



Ф.У.Шкірманкоў.



А.Яскевіч.

**ШКІРМАНКОЎ Фелікс Уладзіміравіч.** Беларускі пісьменнік, публіцыст. Нарадзіўся 27.5.1926 г. у Слаўгарадзе ў сям'і служачага. Скончыў Магаданскі горны тэхнікум (1952), Усесаюзны завочны політэхнічны інстытут (1972). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1951 г. працаваў геолагам, начальнікам геолагаразведачнай партыі на Калыме, паўвостраве Чукотка, узбярэжжы Ахоцкага мора (Расія). У 1979 г. вярнуўся на радзіму. У 1987 г. абраны старшынёй грамадскай камісіі па праблемах Чарнобыльскай катастрофы. Працаваў загадчыкам аддзела ў раённай газеце «Ленінскае слова» (1989—1990). У 1991—1995 гг. старшыня Слаўгарадскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Літаратурнай працай займаецца з 1950-х гадоў. У паэтычных творах пераважае грамадзянска-патрыятычная тэматыка. Выдаў кнігу апавяданняў для дзяцей «Хто пакрыўдзіў мядзведзя?» (1990, на рускай мове), дакументальную аповесць «Выпрабаванне» (1995) пра баявую дзейнасць партызанскай брыгады імя Л.М.Даватара. Аўтар публіцыстычных артыкулаў па чарнобыльскай праблематыцы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Жыве ў Слаўгарадзе.

**ЯСКЕВІЧ Алесь** (Аляксандр Сямёнавіч). Беларускі крытык, літаратуразнавец. Нарадзіўся 12.6.1934 г. у в. Ушакі Чэрыкаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Бацька загінуў на фронце ў 1944 г. Пасля гэтага маці з дзецьмі пераехала ў сваю родную вёску Дабранку Слаўгарадскага раёна. Там, на беразе Сожа, у кутку Васілеўскай пушчы, прайшло пасляваеннае дзяцінства А.Яскевіча. Вучыўся ён у Дабранскай пачатковай школе, Старынскай сямігодцы. У 1953 г. скончыў з сярэбраным медалём Слаўгарадскую СШ. Пасля заканчэння аддзялення журналістыкі БДУ (1958) працаваў у Мінску літсупрацоўнікам шматтыражкі «На страже Октября» (1958—1961), вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры імя Я.Купалы АН Беларусі (1961—1964). З 1964 малодшы, з 1969 старшы, потым вядучы навуковы супрацоўнік сектара тэорыі гэтага інстытута. Доктар філалагічных навук (1992). Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1966 г.

З публіцыстычнымі артыкуламі і допісамі пачаў выступаць у друку ў 1957 г., з крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі ў 1958 г. У полі зроку А.Яскевіча — шматлікія аспекты гісторыі і тэорыі літаратуры, традыцыі і наватарства, станаўленне нацыянальнага класічнага стылю («Нараджэнне новага мастацтва», 1980, у сааўтарстве; «Карані маладога дрэва», 1967), псіхалогія творчасці і індывідуальнасць пісьменніка («Грані майстэрства», 1974), структура празаічнага і вершаванага твора («Ад слова — да вобраза», 1968; «У свеце мастацкага твора», 1977), праблемы літаратурнай метадалогіі, перакладу з блізкамоўных літаратур, аналітычнай перакладчыцкай канцэпцыі («Выхад за круг», 1985). Па-наватарску напісана даследаванне А.Яскевіча «Станаўленне беларускай мастацкай традыцыі» (1987), дзе прасочаны генезіс сучаснай беларускай літаратуры, у новым святле паказана ўзаемадзеянне літаратуры і фальклору. Выступае ў перыядычным друку з праблемнымі артыкуламі па пытаннях развіцця беларускай літаратуры. Распрацоўвае новыя эксперыментальныя падыходы ў даследаванні рытму паэзіі і прозы («Рытмічная арганізацыя мастацкага тэксту», 1991). Спецыялізуецца таксама ў галіне скарыназнаўства і біблеістыкі. Жыве ў Мінску.

*Л.С.Савік.*

*Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. Мн., 1995. Т. 6. С. 521—522.*